Источник: "Беларускі гістарычны часопіс" - №9, 2024-09-30

# Савет маладых вучоных
## Інстытута гісторыі НАН Беларусі

**Савет маладых вучоных — гэта пастаянна дзеючы грамадскі орган пры Прэзідыуме Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Падобныя саветы арганізаваныя пры структурных падраздзяленнях і Прэзідыуме НАН Беларусі з мэтай пашырэння ўдзелу маладых вучоных у развіцці навуковага патэнцыялу, пераадолення негатыўных тэндэнцый ва ўзроставай структуры навуковых кадраў, фарміравання навуковай палітыкі і інтэграцыі навукі і адукацыі.**

Правобразам сучаснага Савета маладых вучоных можна лічыць Бюро аспірантаў, створанае ў 1929 г. як структура Беларускай акадэміі навук. Важнай вяхой у інстытуалізацыі навуковай і грамадскай дзейнасці маладых вучоных стала пастанова Прэзідыума АН БССР ад 20 лістапада 1965 г., згодна з якой ствараўся Савет маладых вучоных. У тыя часы яго дзейнасць была звязаная з камсамолам. Таму пасля перапынення яго існавання ў пачатку 1990-х гг. часова спыніў дзейнасць і Савет маладых вучоных. Аднак запатрабаванасць маладых навукоўцаў у камунікацыйнай пляцоўцы, а таксама спробы кіраўніцтва Акадэміі навук падтрымаць моладзевыя пачынанні і праекты маладых вучоных прывялі да неабходнасці аднаўлення дзейнасці Савета. Таму ў 1998 г. Савет маладых вучоных НАН Беларусі наноў распачаў сваю дзейнасць.

Савет маладых вучоных Інстытута гісторыі НАН Беларусі распачаў сваю дзейнасць у 2003 г. Першым яго старшынёй была абраная М.У.Глеб. Сёння Савет маладых вучоных Інстытута гісторыі НАН Беларусі ўзначальвае аўтар артыкула, пасаду вучонага сакратара Савета займае Д.Пыж.

Абапіраючыся на традыцыі, Савет працуе па некалькіх кірунках: арганізацыя пляцовак для прэзентацыі і апрабацыі навуковых даследаванняў; прафарыентацыя для школьнікаў і студэнтаў; папулярызацыя гістарычнай навукі і дасягненняў Інстытута гісторыі НАН Беларусі.




*Вокладка першага выпуску зборніка навуковых артыкулаў "Ars Longa: навуковыя дасягненні і перспектывы".*

*Савет маладых вучоных Інстытута гісторыі НАН Беларусі, 2023 г.*





Таццяна Даўгач. Савет маладых вучоных Інстытута гісторыі НАН Беларусі




*Удзельнікі "Акадэміі маладых гісторыкаў — 2024".*



*Квэст для дзяцей на "Фестывалі навукі — 2023".*

Важным вынікам дзейнасці Савета стала арганізацыя з 2018 г. штогадовай навукова-практычнай канферэнцыі маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі *"ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы"* з удзелам у тым ліку выкладчыкаў, аспірантаў, магістрантаў і студэнтаў БДУ і БДПУ імя Максіма Танка. Цікавасць да канферэнцыі праявілі прадстаўнікі ўстаноў адукацыі, навукі і культуры Кітая, Літвы, Расіі, Казахстана. Штогадовая канферэнцыя выступае ў якасці платформы для прафесійных кантактаў паміж маладымі гісторыкамі, археолагамі, антраполагамі, міжнароднікамі, музейнымі супрацоўнікамі, а таксама дае магчымасць пачынаючым навукоўцам атрымаць кваліфікаваную дапамогу спецыялістаў.

Акрамя арганізацыі платформы для прафесійнай камунікацыі Савет маладых вучоных Інстытута гісторыі НАН Беларусі заахвочвае да вывучэння гісторыі і, у перспектыве да абрання гістарычнай адукацыі школьнікамі. Менавіта для гэтага з 2022 г. у час вясновых канікул рэалізуецца прафарыентацыйны праект *"Акадэмія маладых гісторыкаў"*. За тры гады яго ўдзельнікамі на інтэрактыўных лекцыях, майстар-класах, практыкумах, экскурсіях сталі больш за 90 вучняў 8—11 класаў. Мяркуем, што дадзены праект дазваляе школьнікам пашырыць свае веды аб развіцці гістарычнай навукі і паказвае перспектывы выбару гістарычнай адукацыі.

Адным з важных кірункаў дзейнасці Савета маладых вучоных з'яўляецца пошук новых падыходаў для папулярызацыі гістарычнай навукі. Традыцыйна вынікамі навуковых даследаванняў маладыя навукоўцы дзеляцца на "Фестывалі навукі" — буйным у Беларусі навукова-асветніцкім мерапрыемстве, якое праходзіць у Цэнтральным батанічным садзе. Маладыя вучоныя ладзяць лекцыі, квэсты, майстар-класы, воркшопы і выставы.

Такім чынам, Савет маладых вучоных Інстытута гісторыі НАН Беларусі адметны наступнымі відамі дзейнасці: стварэнне пляцовак для прэзентацыі і апрабацыі навуковых даследаванняў; прафарыентацыйная работа; папулярызацыя ведаў аб гісторыі Беларусі і асноўных дасягненнях Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Ён заахвочвае маладых вучоных да развіцця навуковых і камунікатыўных здольнасцяў, якія спатрэбяцца ім у прафесійным жыцці.

***Таццяна ДАЎГАЧ, старшы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі IX—XVIII стст. і археаграфіі, старшыня Савета маладых вучоных Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.***